ХРОНІКА ВЫЗВАЛЕННЯ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Дрыса (Верхнядзвінск)

Тып населенага пункта	горад
Раён вобласці	Верхнядзвінскі раён
Год вызвалення	1944
Месяц вызвалення	ліпень
Чысло месяца	12
Вайсковая аперацыя	Рэжыцка-Дзвінская наступальная аперацыя

Горад Дрыса быў акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі 3 ліпеня 1941 года. За час акупацыі яны загубілі тут 769 чалавек. У раённым цэнтры дзейнічалі Дрысенскія падпольныя райкамы КП(б)Б (18.07.1942–26.12.1943; 15.01.–12.07.1944) і ЛКСМБ (18.06.1942–12.07.1944).

У кастрычніку 1942 года партызанамі быў разгромлены варожы гарнізон на станцыі Дрыса.

У пачатку ліпеня 1944 года перадавыя часці Савецкай арміі ўшчыльную падыйшлі да Дрысы. На подступах да горада немцы паспелі ўзвесці ўмацаванні. За горад разгараліся цяжкія баі.

Горад Дрыса вызвалены 12 ліпеня 1944 г. у ходзе Рэжыцка-Дзвінскай наступальнай аперацыі 1944 г.

У вызваленні прымалі ўдзел:

4-я ударная армія – частка сіл 332-ой стралковай дывізіі (палкоўнік Ц. Ф. Ягошын) 83-ці стралковы корпус (генерал-маёр М. Л. Салдатаў).

6-я гвардзейская армія (гвардыі генерал-палкоўнік І. М. Чысцякоў) – 270-я стралковая дывізія (2-га фарм.) (генерал-маёр І. П. Бяляеў).

ЛІТАРАТУРА

1. **Вперед** и вперед // От Вятки до Эльбы: записки военного корреспондента / Д. Ф. Онохин. – Горький : Волго-Вятское книжное издательство, 1975. – С. 184–187.
2. **Дрисса** (Верхнедвинск) // Освобождение городов : справочник по освобождению городов в период Великой Отечественной войны, 1941–1945 / под общ. ред. С. П. Иванова ; авт. коллектив: М. Л. Дударенко [и др.]. – М. : Воениздат, 1985. – С. 86.
3. **Паваліхіна, В. С.** Верхнядзвінск / В. С. Паваліхіна // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін [і інш.]. – Мінск : БелСЭ імя П. Броўкі, 1990. – 679 с.
4. **Рыц, М.** У баях за Верхнядзвінск / М. Рыц // Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 1964. – 2 чэрв. – С. 2.
5. **Сандалаў, Л. М.** За Верхнядзвінск / Л. М. Сандалаў // Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 1964. – 11 ліп. – С. 2. ; 1974. – 6 ліп. – С. 2.
6. **Сандалаў, Л. М**. На подступах да Верхнядзвінска / Л. М. Сандалаў // Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 1973. – 12 ліп. – С. 3.
7. **13.40** – дакладны час вызвалення // Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 2014. – 11 ліп. – С. 1.

13.40 – дакладны час вызвалення // Дзвінская праўда. – 2014. – 11 ліп. – С. 1.

13.40 – ДАКЛАДНЫ ЧАС ВЫЗВАЛЕННЯ

Вызваленне Верхнядзвіншчыны пачалося 30 чэрвеня 1944 года. У аперацыі прымалі ўдзел дывізіі 4-ай ударнай, 6-ай гвардзейскай, 51-а, 22а-й армій (у яе складзе дзейнічаў 13-ы латышскі корпус), 5-ы танкавы корпус.

4 ліпеня адбылося перафарміраванне франтоў. Далейшая заслуга ў вызваленні раёна належыць 1-му Прыбалтыйскаму фронту, найбольш – яго 4-ай ударнай арміі. У вызваленні Дрысы ўдзельнічала таксама 6-я гвардзейская армія таго ж фронту. 22-я армія 2-га Прыбалтыйскага фронту вызваляла Асвейшчыну.

З журнала баявых дзеянняў 119-ай стралковай дывізіі

«Праціўнік у 3.00 11.07 пачаў адыход у паўночна-заходнім напрамку, прыкрываючыся агнём артылерыі і мінамётаў, 365 сп пачаў у 4.40 пераслед адыходзячага праціўніка, у 6.00 полк уварваўся на ўсходнюю ўскраіну мястэчка і станцыю Боркавічы, з ходу збіў заслоны і факельшчыкаў і ў 6.45 цалкам ачысціў Боркавічы. Развіваючы наступленне, завалодаў н.п.Скарада, Няверава, Забелы-1. Праціўнік з паўночнага берага р. Дрыса флангавым кулямётным агнём спыніў полк на заходняй ускраіне н.п. Забелы-1. Камандзір палка прыняў рашэнне абысці адкрытае месца з захаду, і да 17.00 полк выйшаў у Забелы-2, працягваючы рух на Валынцы».

Гадзінай пазней на гэтыя пазіцыі выйшаў і 421-ы полк.

Падтрымліваючы наступленне суседзяў, моцны ўдар па праціўніку нанесла 332-я дывізія. У аперзводцы за 11 ліпеня налічваецца 40 вызваленых вёсак. Вызваліцеляў з 332-ай у гэты дзень сустракалі ў Адамове і Забор'і, Нураве і Барсуках, Вадве, Моханаве і Касталомах. На наступны дзень, развіваючы поспех, дывізія за паўдня прайшла яшчэ 22 кіламетры і вызваліла 43 населеныя пункты ў міжрэччы Дзвіны і Дрысы. Жыхары Прудзінак і Ляшчылава, Хрусталёва і Ракусіна, Цястоў і Шайцерава маглі пачынаць мірнае жыццё.

На ўчастку 1115-га стралковага палка, які рухаўся ўздоўж Заходняй Дзвіны, фашысты арганізавалі ўпартае супраціўленне, замацаваўшыся ў лясным масіве, што цягнуўся ад Несцераў да Смулькава.

Полк нанёс сакрушальны ўдар у напрамку Дрысы, прарваў абарончы рубеж. Адначасова 270-я стралковая дывізія б-ай гвардзейскай арміі разграміла групоўку праціўніка на левым беразе Заходняй Дзвіны. Пасля інтэнсіўнага артабстрэлу 973-ці стралковы полк гэтай дзівізіі на досвітку 12 ліпеня фарсіраваў раку і распачаў вулічныя баі ў горадзе, аблегчыўшы тым самым перадавым часцям 4-ай ударнай арміі задачу па вызваленні Дрысы. 332-я дывізія рапартавала ў штаб 4-ай ударнай арміі:

«12 ліпеня 1115-ты стралковы полк прарваў упартае супраціўленне праціўніка на рубяжах Несцеры–Барсукі–Хараброва, Смулькава–Спартак і м. Дрыса. **У 13.15 перадавыя часці палка ўварваліся ў м. Дрыса і ў 13.40 полк цалкам авалодаў м. Дрыса**».

378-я дывізія ачысціла ад гітлераўцаў усё міжрэчча Свольны і Дрысы да Асвейска-Полацкай шашы.

17 ліпеня часцямі 325-ай стралковай дывізіі 22-ай арміі ва ўзаемадзеянні з партызанскай брыгадай імя М.В. Фрунзе вызвалены г. п. Асвея.